

ЧАТЫРЫ МЕДАЛІ БЕЛАРУСКІХ ШКОЛЬНІЦ 3

ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ У ВЕЛІКОДНЫМ ЭФІРЫ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

22 КРАСАВІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 78 (29700)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ДАШКО, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:**

*«Маніторынг цэн яшчэ раз паказаў, як жывуе наша дзяржава і насельніцтва ва ўмовах санкцый. ...Усе паліцы запоўнены. Нічога не лімітавана, ніякіх абмежаванняў няма. Чарговы раз пераконваемся, што дзяржава ў нас сацыяльная і стараецца рэгуляваць цэны на сацыяльна значныя тавары першай неабходнасці, каб яны былі даступныя насельніцтву. Сітуацыю з цэнамі на спажывецкім рынку парламентарыі рэгулярна кантралююць з лютага мінулага года. Кожны месяц, працуючы ў акругах, маніторым цэны як на лекавыя сродкі, так і прадукты харчавання. Прыязджаючы ў Палату прадстаўнікоў, кожны з нас складае справаздачу з рэкамендацыямі і прапановамі, якія мы напрацоўваем у працэсе гэтай работы».*

# Урокі памяці



У Год гістарычнай памяці Выдавецкі дом «Звязда» пачаў падрыхтоўку кнігі пра партызанскі і падпольны рух у час Вялікай Айчыннай вайны. Мне даручана адказная праца — ілюстраваць старонкі гэтай кнігі, таму я накіраваўся ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — здымаць залы і канцэптуальныя панарамы, вітрыны з экспанатамі, асабістыя рэчы, узнагароды і рабіць рэпрадукцыі партрэтаў вядомых падпольшчыкаў і партызан. Вядомы сталічны музей сустрэў мяне не цішынёй, а галасамі хлопчыкаў і дзяўчынак з экскурсійных груп. Праз залы, у якіх мне неабходна было рабіць здымкі, бясконцым патокам ішлі школьнікі. Адну з такіх груп — старшакласнікаў з Мастоўскага раёна — я сфатаграфаваў у зале, дзе распавядаецца пра жыццё партызанскага атрада ў лесе.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Патрыятычны злёт моладзі стартаваў у «Зубраняці».**
- Еўрапейскі тыдзень імунізацыі пройдзе 24—30 красавіка ў Беларусі.
- **Першая ў краіне крытая пляцоўка для картынгу адкрыецца да жніўня ў Мінску.**
- «Беларуснафта» плануе за чатыры гады прасвідраваць больш за 10 свідравін у Цэнтральнай зоне Прыпяцкага прагіну.
- **Змяненні ў тэхрэгламент аб бяспецы маламерных суднаў можна абмеркаваць на Праваявым форуме. Свае заўвагі і прапановы можна выказаць у спецыяльнай тэме з 21 красавіка да 1 мая.**

ISSN 1990 — 763X

Прыёмная кампанія — 2022

## НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ І ДАДАТКОВЫЯ ЛЬГОТЫ

### Якія яшчэ нюансы трэба ведаць абітурыентам гэтага года?

**Каля 53,5 тысячы першакурснікаў плануецца прыняць сёлета на ўзровень вышэйшай адукацыі. Пра гэта паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.**

План прыёму на бюджэтную форму навучання складае 27,7 тысячы чалавек, на платную — каля 25,8 тысячы. Пры гэтым у структуры бюджэтнай формы дамінуе дзённая форма навучання (гэта каля 23 тысяч чалавек), а на платную форму будзе залічана ўсяго каля 4,5 тысячы. А вось у структуры завочнай формы наадварот — больш месцаў адводзіцца пад платную форму атрымання адукацыі.

### Сіці-менеджмент і біяінфарматыка

Па словах Сяргея Каспяровіча, у бягучым годзе ў беларускіх ВНУ адкрыецца шэраг новых спецыяльнасцяў. Так, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна плануе прыём на спецыяльнасць «урбаналогія і сіці-менеджмент». Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт будзе весці набор на спецыяльнасці «геатэхналогіі турызму і экскурсійная дзейнасць» і «біяінжынерыя і біяінфарматыка». Яшчэ адзін новы напрамак «дызайн (касцюма і тканін)» адкрыецца ў БДУ ў рамках спецыяльнасці «дызайн» на факультэце сацыякультурных камунікацый.

СТАР. 3

Чытач — газета

## ЯК УЖЫЦЦА З СУСЕДЗЯМІ?

**Суседства ў прыватных дамах — не зусім тое ж самае, што суседства ў шматпавярхоўцы, дзе вы можаце жыць гадамі, не ведаючы суседзяў (або абмяжоўваючыся дзяжурным «здрасьце»). У прыватным сектары так не атрымаецца. Таму што дзеянні і звычкі суседзяў наўпрост адбіваюцца і на вашым жыцці.**

СТАР. 4



З першых вуснаў

# «АДВАКАТУРА ПАВІННА БЫЦЬ ПАД КАНТРОЛЕМ, АЛЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ ПАВОДЛЕ ЗАКОНА»

## Прэзідэнт Беларусі прыняў з дакладам міністра юстыцыі

**Адвакатура павінна быць пад кантролем, але дзейнічаць паводле закона і быць сапраўднай, заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам юстыцыі Сяргеем Хаменкам і намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольгай Чупрыс.**

«Адвакат павінен выконваць свае функцыі, не баючыся нічога. Але ў той жа час мы павінны разумець, што гэта дзяржаўны чалавек. І яго дзеянні павінны быць заснаваныя на нормах закона, а не на нейкіх прыдуманых нормах — свабоды слова ці іншых свабод. Мы ўжо наеліся гэтай свабоды. Дзякуй богу, убачылі, якую свабоду нам сюды нясуць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па яго словах, Мінюст павінен не толькі кантраляваць работу адвакатуры, а, як спадзяецца Прэзідэнт, будзе і кіраваць працэсамі, звязанымі з адвакатурай і натарыятам.

«Гэта няпростыя структуры, якія стварaліся зацікаўленымі асобамі ў свой час. Вось чаму я так умешваюся, і ўмешваўся, і кантралюю работу адвакатуры і натарыята. Там некаторыя нешта хацелі займець для сябе. Вы памятаеце, як мне давялося разбураць «банду», якая там была створана. Не думаю, што мы там вырашылі ўсе пытанні», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт паставіў задачу дзяржаўным служачым у хуткім часе пачаць маштабную работу па прывядзенні заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй.

«Мы прынялі папраўкі ў дзеючую Канстытуцыю, стварылі новы каркас нашай дзяржавы ў сферы законатворчасці. Натуральна, мы даўно павінны былі палічыць, колькі нам неабходна змяненняў, дапаўненняў, законаў прыняць у развіццё Канстытуцыі, што сёння дзейнічае і прынятая на рэферэндуме. Гэтую работу неабходна імгненна разгортваць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Як адзначыў Прэзідэнт, адпаведная дзейнасць перадусім ляжа на плечы Сяргея Хаменкі і Вольгі Чупрыс, але займацца ўзгадненнем нормаў будзе ўся краіна.

«Мы ўсе будзем да гэтага працэсу прыцягнуты, бо нарматворчасць не можа залежыць ад двух чалавек ці двух ведамстваў. Уся краіна павінна займацца гэтымі працэсамі. Як новы міністр бачыць Мінюст у дадзеным працэсе і калі мы пачнём гэтую работу? Трэба асноўныя законы прымаць цяпер», — заўважыў кіраўнік краіны.

Яшчэ адно пытанне сустрэчы — стан грамадскіх арганізацый і партый. Паводле слоў Прэзідэнта, у партыйным будаўніцтве чакаецца вельмі вялікая работа. «У парадак неабходна прывесці грамадскія аб'яднанні. Абавязкова неабходна людзям даць сігнал, што такое грамадзянская супольнасць, з чаго яна складаецца, і гэта адлюстраваць у законах. Заканадаўства павінна дакладна гэта вызначаць», — выказаўся Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівую ўвагу кіраўнік дзяржавы аддаў пытанню прымусовага выканання, назваўшы яго «вельмі важным кірункам» дзейнасці Сяргея Хаменкі. «Восем гадоў таму ці больш гэтыя органы былі выдзелены ў асобную службу. Як яны функцыянуюць сёння? Чаго не хапае? І пытанне ў сувязі з гэтым, якое вызначалася на апошняй нарадзе: выкананне рашэння судоў, — сказаў Прэзідэнт. — Запазычанасць у бюджэт павінна быць жалезабетонна выканана. Вы як генерал павінны разумець, што гэта павінна быць вырашана. Гэта пакаранне, прынятае судом. Яго ніхто не аспрэчвае, нават свядомыя, збеглыя і іншыя, не кажучы ўжо аб нармальных людзях, што жывуць у нашай краіне».

Паводле слоў кіраўніка краіны, да канца года ўсе судовыя патрабаванні павінны быць выкананы. «Не выканаюць, вы ведаеце, што рабіць. Пра гэта я ўжо казаў на мінулай нарадзе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што Сяргей Хаменка быў назначаны на пасаду паўгода таму, але з-за напружанасці работы яе можна прыраўняць да ваеннай і памножыць на два.

«Мы з вамі дамаўляліся, што вы свежым вокам паглядзіце на Мінюст, і як чалавек, не вельмі звязаны з нарматворчасцю, кантролем, арганізацыяй нарматворчага працэсу, падумаеце, як удасканаліць работу Міністэрства юстыцыі. Калісьці і Вольга Іванаўна (Чупрыс. — **«Зв.»**) збоку прыйшла на гэтую работу. Хоць яна і вучоны-юрыст, тым не менш, арганізоўваць работу і быць вучоным — розніца, як і ў вас», — сказаў Прэзідэнт.

Ён абазначыў канкрэтныя пытанні, на якія таксама хацеў пачуць адказы ад міністра: як з выканаўчай дысцыплінай у ведамстве? Як працуюць кадры? Бо работа з імі, па словах Прэзідэнта, нумар адзін заўсёды была, ёсць і будзе.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

**Міністр юстыцыі Сяргей ХАМЕНКА** расказаў, што на дакладзе ўдзялілі ўвагу павышэнню даступнасці паслуг адвакатуры і натарыята і прафесіяналізму гэтых спецыялістаў. Міністр адзначыў: адвакат і натарыус — людзі дзяржаўныя, таму і ў сваёй дзейнасці павінны прытрымлівацца прынцыпу законнасці.

«Так, для іх дзейнічаюць прынцыпы (і яны закладзены ў заканадаўства) — даступнасць, незалежнасць і законнасць. Але асноўным словам з'яўляецца законнасць. Адвакат незалежны на працэсе і падчас выканання задач, якія стаяць перад ім у рамках прафесійнай дзейнасці. Разам з тым, фундаментам стабільнага жыцця нашага грамадства з'яўляюцца дзяржаўнасць кожнага чалавека», — заявіў Сяргей Хаменка.

Таксама на сустрэчы з Прэзідэнтам разгледжана дзейнасць органаў прымусовага выканання і магчымасць надання ім большай значнасці.

«У органах прымусовага выканання працуюць людзі, якія павінны ў поўным аб'ёме выконваць рашэнні судоў. А рашэнні судоў нясуць дабро людзям і ў жыццё ўкараняюць прынцып «злачынца павінен быць пакараны, а людзі, якія ад яго пацярпелі, павінны займець дабро, вызначанае дзяржавай», — сказаў суразмоўнік.

Ён адзначыў, што ў айчыннай сістэме прымусовага выканання ёсць свае недахопы, а многія асуджаныя шукаюць магчымасці сысці ад выканання рашэнняў судоў. Міністр юстыцыі расказаў, якія падыходы павысяць эфектыўнасць работы органаў прымусовага выкання і ўзровень спагнання запазычанасці з даўжнікоў.

«Пастаўлена задача кіраўніком краіны: павысіць узаемадзеянне паміж судовымі органамі, органамі прымусовага выканання, Следчым камітэтам, Генеральнай пракуратурай і Камітэтам дзяржаўнага кантролю. Калі паміж гэтымі органамі будзе наладжанае цеснае ўзаемадзеянне, то, упэўнены, пры дыферэнцыраваным падыходзе ў ходзе следства, пры прыняцці рашэння суда зыходзячы з пэўных характарыстык юрыдычнай ці фізічнай асобы і пэўных дзеянняў органаў прымусовага выканання гэтае пытанне можна вырашыць, асабліва ў дачыненні да фізічных асоб», — канстатаваў Сяргей Хаменка.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сі Цзіньпін выступіў супраць двайных стандартаў і юрысдыкцыі «доўгай рукі»



Аб гэтым старшыня КНР заявіў у сваім відэазвароце на цырымоніі адкрыцця Боаоскага азіяцкага форуму. «Мы не прымаем двайныя стандарты, выступаем супраць неабгрунтаванага выкарыстання аднабаковых санкцый і юрысдыкцыі «доўгай рукі», — сказаў Сі Цзіньпін. Ён дадаў, што Кітай па-ранейшаму адданы мірнаму ўрэгуляванню рознагалоссяў і спрэчак паміж краінамі праз дыялог і падтрымлівае ўсе намаганні, якія садзейнічаюць мірнаму ўрэгуляванню крызісаў. Лідар КНР таксама адзначыў, што ўсе краіны свету падобныя на пасажыраў на борце аднаго карабля, якія падзяляюць адзін лёс. Каб карабель змог справіцца са штормам і плыць да светлай будучыні, усе пасажыры павінны згуртавацца. Паводле яго слоў, думка аб тым, каб выкінуць каго-небудзь за борт, проста непрымальная. Сі Цзіньпін падкрэсліў, што ў нашы дні міжнародная супольнасць стала складанай інтэграванай сістэмай, і калі выдаліць адну дэталь, то ў рабоце ўсяго механізма ўзнікнуць сур'ёзныя праблемы. Калі гэта адбудзецца, і тыя, на каго накіраваны дзеянні, і самі ініцыятары апынуцца ў пройгрышы.

### Японская ена рэкордна абвалілася

Рост працэнтных ставак па амерыканскіх дзяржаблігацыях справакаваў рэкордны абвал японскай ены. Яна беспярапынна зніжаецца ў адносінах да долара ўжо больш за два тыдні. Такога працяглага беспярапыннага падзення ены ў гісторыі Японіі яшчэ не было, адзначыў expert.ru. З кожным днём павялічваецца верагоднасць умяшання Міністэрства фінансаў Японіі праз Bank of Japan (BOJ). Кіраўнік BOJ Харухіка Курода заняў жорсткую пазіцыю па нацыянальнай валюце і заявіў, што галоўны японскі банк будзе трымаць праграму стымулявання пад кантролем. Пры гэтым падзенне японскай валюты, на думку спецыялістаў, павінна паскорыцца. «Цяпер здаецца, што нішто не ў стане перашкодзіць руху пары «долар — ена» ўверх, таму што стаўкі па амерыканскіх аблігацыях растуць», — тлумачыць абвал галоўны стратэг Resona Holdings Шынсуке Каджыта.

### На баку Украіны ваюе каля сямі тысяч замежных наёмнікаў з 63 краін

Найбольш прадстаўлены ва ўкраінскіх нацыяналістычных групоўках грамадзяне Польшчы, ЗША, Канады, Румыніі, Вялікабрытаніі і Грузіі. Аб гэтым заявіла на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава. «Захад падтрымлівае ўкраінскіх нацыяналістаў не толькі зброяй, але і кадрамі, гэта значыць, пастаўляючы туды наёмнікаў, падрыхтаваных у розных пунктах свету экстрэмістаў», — падкрэсліла Марыя Захарава. Яна таксама звярнула ўвагу, што колькасць замежных наёмнікаў ва Украіне зніжаецца. «Расійскімі ўзброенымі сіламі знішчана больш за тысячу наёмнікаў, яшчэ каля тысячы адмовілася ўдзельнічаць у баявых дзеяннях і вярнулася ў месцы сваёй ранейшай экстрэмісцкай дыслакацыі. Па міжнародным гуманітарным праве замежныя наёмнікі не маюць статусу камбатантаў і не могуць разлічваць на адпаведную прававу абарону, — нагадала Марыя Захарава. — Замест лёгкіх грошай іх чакаюць, у найлепшым выпадку, крымінальная адказнасць і працяглыя тэрміны зняволення».

Блізкая ўлада

## Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 23 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васільевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ВЕРХ ЕЎРАПЕЙСКАГА ЦЫНІЗМУ І НАХАБСТВА

**Вайна ў галовах і свядомасці жыхароў планеты набывае ўсё большы размах. Пры гэтым усё пераварочваецца дагары нагамі. Найперш многія палітыкі, арганізатары інфармацыйнай вайны імкнуцца сказіць гістарычныя факты, прыўнесці ў свядомасць маладых пакаленняў хлусню і бруд.**

**Як рэакцыя на гэта — заява прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі аб недапушчальнасці акцый, накіраваных на зрыў святкавання Дня Перамогі над нацысцкай Германіяй.**

«Набліжаецца 77-я гадавіна Вялікай Перамогі савецкага народа і ўсіх народаў антыгітлераўскай кааліцыі над нацысцкай Германіяй, гадавіна заканчэння Другой сусветнай вайны ў Еўропе, — гаворыцца ў заяве, якую падпісалі беларускія пісьменнікі. — Незалежна ад палітычных сістэм у краінах-пераможцах і ўваходжання ў розныя ваенныя блокі святасць подзвігу нашых бацькоў і дзядоў доўгія гады не выклікала ніякага сумнення.

Але шмат што змяняецца не ў лепшы бок. З пачуццём абурэння мы, пісьменнікі Беларусі, пачулі пра акт, учынены 10 красавіка на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Бухенвальд». Неўстаноўленая асоба (пакуль яшчэ не ўстаноўленая) зняла дзяржаўны сцяг Беларусі, які стаяў у шэрагу іншых дзяржаўных сцягоў, і замяніла яго на бела-чырвона-белы. Ён так і застаўся вісець у наступныя дні. Калі ў кагосьці кароткая памяць, нагадваем: у нацысцкіх канцлагерах масава знішчаліся ўраджэнцы Беларусі, а зганялі іх, як жывёлу на забой, паліцаі-калабарацыяністы, якія выкарыстоўвалі бела-чырвона-белую сімволіку. Генеральная пракуратура Беларусі ў сувязі з гэтым распачала крымінальную справу па факце распальвання нацыянальнай варожасці і дасць прававую ацэнку зробленаму. Мы сваю ацэнку гатовыя даць ужо цяпер: гэта плявок у твар беларусам.

Не меншае абурэнне выклікае прыняцце латышскім Сеймам закона, які аб'яўляе 9 мая днём памяці загінулых ва Украіне. У рэспубліцы настане жалоба, 8 і 9 мая забараняюцца любыя святочныя мерапрыемствы і салюты.

Лічым гэтае рашэнне непрымальным. Кіраўніцтва нашай дзяржавы актыўна садзейнічае перагаворам паміж расійскай і ўкраінскай дэлегацыямі дзеля найхутчэйшага спынення агню. Адначасова мы рыхтуемся да 9 Мая — дня наступлення міру на шматпакутнай зямлі Еўропы, нашага агульнага дома з іншымі народамі. Менавіта міру і гарантый бяспекі сёння не хапае больш за ўсё.

Мы перакананыя, што забарона святкавання Дня Перамогі складае верх цынізму і крывадушнасці, хоць і не здзіўляе. Скажам проста: значная частка латышоў ваявала на баку гітлераўцаў супраць Чырвонай Арміі і савецкіх партызанаў, а не супраць нацыстаў. Немцы сфарміравалі дзве латышскія добраахвотніцкія дывізіі СС, якія змагаліся на Усходнім фронце, праз іх прайшло звыш 115 тысяч легіянераў. Беларусы добра памятаюць карныя акцыі латышскіх паліцаяў, што не саступаюць у жорсткасці ўкраінскім нацыяналістам, якія спалілі Хатынь. Абразлівы для сусветнай супольнасці факт: ветэраны дывізій латышскага легіёна СС, якія дажылі да нашых дзён, карыстаюцца ў рэспубліцы пашанай і павагай.

А ў нас свая гістарычная памяць: мы шануем герояў 43-й гвардзейскай Латышскай стралковай дывізіі Чырвонай Арміі.

Адмовай ад святкавання 9 мая сучасная латышская ўлада канчаткова пераводзіць краіну з ліку пераможцаў нацызму ў шэрагі пераможаных памагатых гітлераўцаў. А пад'ём у Германіі сцяга, які сімвалізуе, акрамя ўсяго іншага, вяртанне да нядобрых часоў, калі беларускія нацыянал-здраднікі супрацоўнічалі з акупантамі, сведчыць пра выспяванне ў нямецкім грамадстве вельмі трывожных тэндэнцый.

Саюз пісьменнікаў Беларусі заклікае ўсіх літаратараў Германіі і Латвіі, усіх дзеячаў культуры і мастацтва Еўропы данесці да кірующих колаў і да выбаршчыкаў у сваіх дзяржавах адвечную думку аб абсурднасці і недапушчальнасці скажэння ваеннай гісторыі. Германскі нацызм прайграў і быў знішчаны. Навошта ісці за пераможанымі і паўтараць заведама пагібельны шлях?»

# НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ І ДАДАТКОВЫЯ ЛЬГОТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

БНТУ аб'явіў набор на спецыяльнасці «эканоміка і арганізацыя вытворчасці» па напрамку «лічбавыя тэхналогіі на прамысловым прадпрыемстве» — гэта так званая індустрыя 4.0. БДТУ запрашае абітурыентаў на мадэрнізаваную спецыяльнасць «тэхналогія і перапрацоўка біяпалімераў». Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт правядзе набор на спецыяльнасць «японская мова і другая замежная мова» са спецыялізацыяй «спецыяльны пераклад».

Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт адкрывае спецыяльнасць «інструментальныя сродкі і тэхналогія праектавання інтэлектуальных сістэм». Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. А. Сухога — спецыяльнасць «кіраванне дызайн-праектамі на прамысловым прадпрыемстве». У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы распачнецца падрыхтоўка па новых спецыяльнасцях «аналітычная біяхімія» і «біяхімія лекавых сродкаў». А факультэт гісторыі камунікацыі ўпершыню ажыццявіць набор на «вэб-журналістыку».

**Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе 14 чэрвеня з беларускай мовы. Самымі масавымі выпрабаваннямі традыцыйна будуць ЦТ па матэматыцы і рускай мове. Пад іх правядзенне «забраніравана» па два дні.**

Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава адкрывае спецыяльнасць «спартыўна-педагагічная дзейнасць», дзе будуць рыхтаваць спецыялістаў для трэнерскай работы, а Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова — спецыяльнасць «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі».

Трэба заўважыць, што адкрыць новую спецыяльнасць — вельмі працаёмкі працэс, які патрабуе дэталёвай распрацоўкі адукацыйнага стандарту і тыпавога навучальнага плана, узгаднення з Міністэрствам адукацыі, узаемадзеяння з будучымі заказчыкамі кадраў і пацвярджэння запатрабаванасці адпаведных спецыялістаў.

А вось абітурыентам, якія плануюць паступаць сёлета на журфак БДУ, варта мець на ўвазе, што на спецыяльнасцях «журналістыка» і «міжнародная журналістыка» будуць толькі бюджэтныя месцы, платнай формы навучання не прадугледжана. Толькі на спецыяльнасці «інфармацыя і камунікацыя» для платнікаў адведзена 9 месцаў. Агульны план прыёму на бюджэт складае 91 чалавек.

— Фарміраванне лічбаў прыёму на бюджэтную і платную формы навучання — гэта сур'ёзная і карпатлівая работа, звязаная з аналізам патрэб адпаведных арганізацый і дагавораў, заключаных установамі адукацыі з заказчыкамі кадраў, — патлумачыў Сяргей Каспяровіч. — Сёння акцэнт у дзяржаўнай інфармацыйнай палітыцы робіцца ў бок развіцця дзяржаўных СМІ. Ва ўсіх абітурыентаў ёсць права ўдзельнічаць у конкурсе і паступіць на бюджэтную форму і, адпаведна, быць потым размеркаванымі ў любую арганізацыю інфармацыйнага сектара. У першую чаргу — да заказчыка кадраў. Сёлета, з улікам аналізу размеркавання выпускнікоў, універсітэтам і было прынята такое рашэнне. Пры гэтым хачу адзначыць, што прыём на спецыяльнасць «журналістыка» таксама ёсць і ў іншых установах адукацыі. Напрыклад, у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.

## Без экзаменаў

Сяргей Каспяровіч звярнуў увагу на тое, што ў новых рэдакцыях Кодэкса аб адукацыі і Правілаў прыёму істотна пашыраюцца магчымасці мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў як формы дзяржаўнага заказу. Калі раней яна распаўсюджвалася толькі на пэўныя населеныя пункты (чарнобыльскія, сельскія рэгіёны, гарады з насельніцтвам да 20 тысяч), то цяпер такі дагавор можа заключыць арганізацыя — заказчык кадраў, якая знаходзіцца ў любым населеным пункце Беларусі. На сельскагаспадарчых спецыяльнасцях пад мэтавы набор можа адводзіцца да 60 працэнтаў месцаў, на медыцынскіх — да 50 і на ўсіх астатніх — да 40 працэнтаў.

Цяпер наконт ільгот. З 2022 года без уступных экзаменаў будуць залічваць у ВНУ выпускнікоў спартыўна-педагагічных класаў — на спецыяльнасці ў сферы фізічнай культуры і спорту; абітурыентаў, якія паступаюць па дагаворах аб мэтавай падрыхтоўцы на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці па пераліку, што вызначае Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Без экзаменаў змогуць паступаць і абітурыенты, якія здавалі Адзіны дзяржаўны экзамен у Расіі — у тым выпадку, калі яны паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, найбольш запатрабаваныя эканомікай. Іх пералік вызначаецца Міністэрствам адукацыі. Прычым для такіх абітурыентаў устаноўлена квота ў 20 працэнтаў ад лічбаў прыёму. У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што дадзенае новаўвядзенне зможа павысіць зацікаўленасць абітурыентаў з Расійскай Федэрацыі ў атрыманні вышэйшай адукацыі ў нашай краіне.

**Фарміраванне лічбаў прыёму на бюджэтную і платную формы навучання — гэта сур'ёзная і карпатлівая работа, звязаная з аналізам патрэб адпаведных арганізацый і дагавораў, заключаных установамі адукацыі з заказчыкамі кадраў.**

Паступіць па-за конкурсам змогуць выпускнікі ваенна-патрыятычных класаў — ва ўстановы Міністэрства абароны, Дзяржпагранкамітэта і на ваенныя факультэты (пры адзнаках не ніжэй за 6 балаў у атэстаце). У ВНУ Мінабароны змогуць пайсці тыя, хто прайшоў факультатыў «Гатовы Радзіме служыць», у ВНУ Дзяржпагранкамітэта — факультатыў «Юны пагранічнік». Для абедзвюх катэгорый устаноўлена квота ў 30 працэнтаў ад лічбаў прыёму.

## «Педагагічнае суправаджэнне»

Прыём на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2022 годзе будуць ажыццяўляць 110 установаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 84 установы адукацыі, якія рэалізуюць адпаведныя праграмы, у асноўным філіялы ВНУ. План прыёму сфарміраваны з улікам патрэб заказчыкаў кадраў — усяго чакаецца прыняць каля 39,5 тысячы чалавек. Пры гэтым на дзённую форму — 24,3 тысячы абітурыентаў: на аснове агульнай базавай адукацыі — 14,7 тысячы чалавек і на аснове агульнай сярэдняй адукацыі — 7,6 тысячы. На завочную бюджэтную форму плануецца прыняць дзве тысячы абітурыентаў. На платную форму навучання сумарна плануецца прыняць 13,2 тысячы чалавек, пры гэтым на дзённую — 9,3 тысячы і на завочную — 3,9 тысячы абітурыентаў.

17 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі пашырылі пералікі спецыяльнасцяў, па якіх будуць ажыццяўляць падрыхтоўку. Напрыклад, Мінскі гарадскі педагагічны каледж і Ваўкавыскі каледж ГрДУ імя Я. Купалы ўпершыню аб'яўляць прыём на новую спецыяльнасць «педагагічнае суправаджэнне». Каледжы пачынаюць рыхтаваць выхавальнікаў для персанальнага суправаджэння навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Гэта зусім новая спецыяльнасць. Зыходзячы з перспектыў развіцця сістэмы адукацыі і прапаноў арганізацый-заказчыкаў кадраў, можна казаць аб высокай запатрабаванасці кадраў такой кваліфікацыі. Выпускнікі атрымаюць магчымасць працаўладкавацца не толькі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, але і ў выхаваўча-аздараўленчых установах адукацыі, цэнтрах карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, сацыяльна-педагагічных цэнтрах з прытулкам і іншых установах адукацыі, якія рэалізоўваюць праграмы выхавання.

Пры гэтым таксама адкрываюцца новыя спецыяльнасці для асобных устаноў адукацыі. Так, у філіяле БНТУ «Мінскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы каледж» адкрываецца спецыяльнасць «архітэктурны дызайн гарадскога асяроддзя». Беларускі дзяржаўны каледж прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, філіял БДТУ, адкрывае спецыяльнасць «абслугоўванне сістэм водападрыхтоўкі і водаачысткі».

## Дадатковы час на ЦТ

2 мая ў краіне распачынаецца рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне. **Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК** нагадаў, што яна прадоўжыцца да 1 чэрвеня ўключна. Абітурыенты могуць запоўніць анкету папярэдняй рэгістрацыі ў асабістым кабінеце на сайце РІКВ або асабіста наведаць выбраны пункт тэсціравання. Папярэдняя рэгістрацыя будзе даступная з 9 гадзін 2 мая да 12 гадзін 1 чэрвеня. У апошні дзень пасля 12 гадзін і да закрыцця пунктаў рэгістрацыі ў 19 гадзін падаць заяву на ўдзел у ЦТ можна будзе толькі асабіста.

Абітурыентам дазваляецца зарэгістравацца не больш як на чатыры дысцыпліны. Такім чынам, у іх ёсць магчымасць ракіроўкі пры паступленні на родназыя спецыяльнасці.

Рэгістрацыя завяршаецца атрыманнем пропуску, па якім трэба звярнуцца не пазней за 1 чэрвеня. У графе «Абраныя прадметы і пункты тэсціравання» будуць указаны адрасы пунктаў рэгістрацыі (іх 41), у адзін з якіх неабходна будзе звярнуцца пасля здзяйснення аплаты. Пры сабе трэба мець пашпарт або пасведчанне на жыхарства, пасведчанне бежанца. Забраць пропускі замест абітурыента могуць таксама яго законныя прадстаўнікі.

Менавіта ў пропуску ўказваецца інфармацыя, калі і куды трэба прыходзіць у дзень правядзення тэсціравання. Пропуск для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні лічыцца зарэгістраваным, калі на ім маецца пячатка ўстановы, вызначанай пунктам правядзення ЦТ, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і рэгістрацыйны нумар. У выпадку страты пропуску выдаецца дублікат.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе 14 чэрвеня з беларускай мовы. Самымі масавымі выпрабаваннямі традыцыйна будуць ЦТ па матэматыцы і рускай мове. Пад іх правядзенне «забраніравана» па два дні.

— Рассадка ў аўдыторыях прадугледжваецца камфортная і бяспечная. Акрамя таго, сёлета ў інтарэсах абітурыентаў было прынята рашэнне павялічыць на 30 хвілін час выпрабаванняў па фізіцы і матэматыцы, — расказаў Юрый Міксюк. — Калі казаць аб матэрыялах ЦТ, то на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў ужо даўно размешчана спецыфікацыя тэстаў. Абітурыенты маглі з ёй азнаёміцца і прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне ў розных формах (афлайн і анлайн). Таму ўсе маглі пераканацца, што істотных змяненняў у плане складанасці і структуры тэстаў няма. Абітурыенты могуць спакойна рыхтавацца да здачы ЦТ, прыйсці, паказаць свае школьныя веды, і гэтага будзе дастаткова. Завяршыцца асноўны этап ЦТ 6 ліпеня. Тэрміны рэгістрацыі абітурыентаў для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — з 2 да 7 ліпеня. Але для таго каб быць допушчанымі да здачы ЦТ у рэзервовыя дні, патрабуюцца ўважлівыя прычыны.

---

Ведай нашых!

# МАТЭМАТЫЧНЫ АЛІМП ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ

**Чатыры медалі заваявалі беларускія школьніцы на 11-й Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе для дзяўчат. Спаборніцтвы праходзілі з выкарыстаннем дыстанцыйных тэхналогій. Іх арганізатарам выступіла Венгрыя.**




Еўрапейская алімпіяда па матэматыцы праводзіцца пачынаючы з 2012 года для раскрыцця матэматычных здольнасцяў дзяўчат. Спаборніцтвы арганізаваны па мадэлі Міжнароднай матэматычнай алімпіяды. Узяць удзел у іх могуць і неееўрапейскія краіны ў якасці гасцей. Так, у 11-й Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе для дзяўчат удзельнічалі 56 каманд з розных краін свету, з якіх 37 — еўрапейскія.

Па рэгламенце спаборніцтвы праводзяцца два дні, кожны дзень удзельніцы павінны былі рашаць задачы на працягу 4,5 гадзіны. Ім прапаноўвалася рашыць па тры задачы высокага ўзроўню складанасці са сферы элементарнай матэматыкі — алгебры, камбінаторыкі, геаметрыі і тэорыі лікаў.

Каманда Рэспублікі Беларусь упершыню ўзяла ўдзел у матэматычным спаборніцтве ў 2013 годзе. Тады беларуская дзяўчаты заваявалі тры залатыя і адзін бронзавы медалі, заняўшы першае агульнакамандные месца. А ў 2015 годзе Беларусь стала арганізатарам Еўрапейскай алімпіяды, у якой спаборнічалі каманды з 29 краін.

Усяго ж з 2013 года беларускія школьніцы заваявалі шэсць залатых, дзесяць сярэбраных і дзевятнаццаць бронзавых медалёў.

Вынікам удзелу нашых дзяўчат у алімпіядзе сёлета сталі адзін залаты і тры бронзавыя медалі. Залатой узнагароды ўдастоена навучэнка 11 класа гродзенскай гімназіі № 3 Мілана Пагасян. Бронзавыя медалі заваявалі дзесяцікласніца віцебскай гімназіі № 2 Аліна Вяруціна, адзінаццацікласніца віцебскай гімназіі № 8 Вера Грэцкая і навучэнка 11 класа мінскай гімназіі № 41 Марыя Брэль.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЯК УЖЫЦЦА З СУСЕДЗЯМІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І бывае, што адносіны паміж жыхарамі суседніх дамоў (плот у плот) перарастаюць у сур'ёзнае супрацьстаянне. У ход ідуць усе метады вядзення барацьбы, якія (часцей за ўсё) не супярэчаць закону, але здольныя сур'ёзна сапсаваць жыццё, прычым абодвум бакам канфлікту.

Сярод лістоў, якія прыходзяць у рэдакцыю, скаргі на суседзяў (па лецішчы або прыватным доме) складаюць значны працэнт зваротаў. Найбольш частыя прычыны супрацьстаяння — зямельныя (тэрытарыяльныя): не на месцы стаіць плот, блізка да ўчастка заяўніка сусед высадзіў дрэва або хмызнякі, што загароджваюць сонечнае святло; будаўнічыя: сусед паставіў лазню або хлеў са свайго боку плота, але ў непасрэднай блізкасці да чужых пабудоў ці градак; камунікацыйныя: шум з боку суседскага ўчастка, які не дае паўнавартасна адпачыць; і, нарэшце, «непадабенства характараў» (часцей за ўсё на гэта скардзяцца, калі суседзі «новыя» (суседні дом памяняў уладальнікаў), і пачаліся «баявыя дзеянні»)...

## У МЕЖАХ ЗАКОНА

Перш за ўсё адзначым: выбіраючы з двух шляхоў — скандалы і лаянка або зварот у адпаведныя дзяржаўныя органы, спыніцца варта на другім варыянце. Калі вы перакананы, што сусед спецыяльна паставіў плот так, каб адхапіць ваш кавалак зямлі, варта падняць дакументы на ўчастак і запрасіць спецыялістаў для размежавання (калі вы маеце рацыю, а сусед не, экспертызу будзе аплачваць ён). Калі казаць аб насаджэннях або пабудовах на суседскім участку ў непасрэднай блізкасці ад вашага ўчастка, тут таксама ёсць дакладныя заканадаўчыя абмежаванні. Адлегласць ад плота да дрэў, кустоў або пабудоў суседа меншая, чым устаноўлена па законе? Можна смела звяртацца ў адпаведныя дзяржаўныя інстанцыі.

Іншая справа, што ў многіх сітуацыях, якія ўзнікаюць паміж суседзямі ў прыватным сектары, няма адназначна тых, хто мае рацыю, і вінаватых. Кантралюючыя органы пры рэалізацыі грамадзянамі сваіх правоў на зварот, зразумела, праводзяць праверкі. Але вынікі гэтых праверак могуць не задаволіць тых, хто звярнуўся. У гэтым выпадку звяртацца ў дзяржаўныя органы і ў суд грамадзяне могуць неаднаразова. Праўда, варта ўлічваць і той факт, што зацяжны канфлікт з суседам ні да чога добрага не прыводзіць, бо жыць усё роўна прыйдзецца побач.

## ЖЫЦЦЁ КАЛЯ СКЛАДА

Але часам бывае, што сітуацыя здаецца безвыходнай...

Будучы ўладальнікам дома ў прыватным сектары, чалавек спадзяецца на цішыню і спакой. Асабліва калі гэта чалавек пажылы. Але здарылася так, што ўладальнікам дома, суседняга з домам Уладзіміра Мікалаевіча (па вуліцы Наватарскай у сталіцы), пасля смерці ранейшага гаспадара стаў яго сын Дзмітрый. І, з'яўляючыся саўладальнікам малога бізнесу па продажы аўтамабільных шын, ён адкрыў у старым бацькоўскім доме офіс і пабудаваў каля дома склад.

— Акно маёй спальні выходзіць наўпрост на гэты склад. Участкі ў нас па 4,5 соткі, а не па 10—20, як за горадам. Грукат, шум, адгрузкі і загрузкі. Гэта вельмі перашкаджае жыць, — расказвае Уладзімір Мікалаевіч. — Разгрузкі ідуць па дзве-тры гадзіны з самай раніцы. Потым пачынаюць развозіць шыны па гандлёвых пунктах на рынках.

Спачатку суседзі спрабавалі трываць, распавядае суразмоўца. Нават нягледзячы на тое, што летам, у спякоту, да нязручнасцяў далучаецца яшчэ і характэрны пах нагрэтай гумы, які адчуваецца на суседніх участках.

— І трывалі, пакуль сусед не акрыліўся, усё гэта не разраслося і не пайшла разгрузка фурамі. Усе, хто падпісалі нашу калектыўную скаргу, — людзі пенсійнага ўзросту. Па-першае, гэты яго бізнес пажылым людзям не дае спакойна адпачываць. А, па-другое, практычна ў кожным суседнім з участкам Дзмітрыя доме ёсць пенсіянеры па ўзросце, у тым ліку інваліды, з якімі жывуць унукі (або часта прыязджаюць да іх).

Хваляванне за бяспеку ўнукаў (бо дзеці могуць выбегчы з двара прыватнага дома на вуліцу і трапіць пад машыну), па словах суразмоўцы, — яшчэ адзін фактар, які паўплываў на рашэнне пенсіянераў пісаць скаргі і хадзіць па інстанцыях. «Па нашай вуліцы цяпер ездзяць грузавыя машыны. Часта яны стаяць па некалькі гадзін, перакрываючы вуліцу», — распавядае ён.

— Мы ўжо год пішам ва ўсе інстанцыі. Першы раз калектыўна звярнуліся 3 сакавіка 2021 года і з тых часоў займаемся гэтай абсалютна бытавой праблемай. Калі звярталіся першы раз са скаргай у Цэнтральны РАНС Мінска, думалі, што сітуацыя вельмі хутка вырашыцца на нашу карысць.

Але тут суседзі паспяшаліся з высновамі.

— У адміністрацыі Цэнтральнага раёна нам адказалі, што парушэнняў у сферы вядзення бізнесу і падатковага заканадаўства ў суседа няма. Ну, добра, калі, згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва», сусед можа мець офіс ва ўласным доме — няхай працуе. Але склад мы просім ліквідаваць. Калі б гэты склад быў афіцыйна зарэгістраваны як складское памяшканне, я б, напэўна, прадаваў свой дом і пераязджаў у іншае месца, — кажа пенсіянер. — Але гэта проста самавуд.

Адзіныя, да каго ў канцы мінулага года ўдалося дастукацца жыхарам вуліцы Наватарскай, — пракуратура, распавядаюць яны.

— Там да нас сапраўды паставіліся ўважліва, мы атрымалі заключэнне за подпісам пракурора раёна: «Парушэнне нормаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якое выявілася ў ажыццяўленні дзейнасці па складзіраванні і захоўванні аўтамабільных і транспартных пакрышак, шумнай пагрузцы і выгрузцы шын адначасова з выкарыстаннем не па прызначэнні зямельнага ўчастка...» ад 18.10.21, — распавядае Уладзімір Мікалаевіч. — Кіраўніку адміністрацыі раёна пракуратурай было накіравана інфармацыйнае пісьмо аб неабходнасці прыняцця дадатковых мер. Таксама атрымалі мы адказ ад МНС — быў выяўлены факт парушэння супрацьпажарных нормаў. Але ў цэлым ніхто не хоча займацца гэтай праблемай. Вось і робіць сусед, што хоча, і пляваць яму на ўсё. Я яму кажу: «Пракуратура знайшла парушэнні ў тваёй дзейнасці». А ён у адказ: «Пішыце куды хочаце». І што нам рабіць? Прыйшла камісія выканкама: супрацоўнік МНС, прадстаўнікі санстанцыі, гарадской гаспадаркі, архітэктуры для праверкі аб'екта. Дык сусед іх на сваю тэрыторыю не пусціў. Патэлефанавалі яму. А ён: «Я ў Бабруйску, буду толькі ў канцы дня». А народ ходзіць на ўчастку, у доме святло гарыць — відаць, што людзі ёсць. Мы кажам: вунь жа людзі, хай адкрыюць, ён — не: «Без мяне камісію ніхто не пусціць».

Уладзімір Мікалаевіч і сам шмат гадоў займаўся бізнесам. Вырашыў пагутарыць з суседам як бізнесмен з бізнесменам.

— Прапаноўваў: давай куплю ў цябе гэты дом. Ты на гэтыя грошы купіш склад у прамысловым раёне, людзям перашкаджаць не будзеш. Не пагадзіўся. Быў бы бізнесмен, зрэагаваў бы на гэтую прапанову. Тым больш крыўды ў яго на суседзяў быць не можа: мы з ім раней, да 2021 года, не перасякаліся, бізнесу яго не перашкаджалі. Трывалі вельмі доўга. Хадзілі, прасілі. Пакуль не зразумелі, што не мае сэнсу з ім размаўляць.

## НА ЧЫІМ БАКУ ПРАЎДА?

— З пісьмовых адказаў на звароты заяўнікаў у дзяржаўныя органы відаць, што звароты разгледжаны належным чынам у адпаведнасці з патрабаваннямі дзеючага заканадаўства, а атрыманыя адказы з'яўляюцца абгрунтаванымі і матываванымі, — каментуе сітуацыю **адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ.** — Пытанне ў частцы складавання аўтамабільных шын у гаражы разгледжана ў ходзе нарады, якая адбылася ў адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска з удзелам усіх зацікаўленых асоб, у тым ліку прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага санітарнага і пажарнага нагляду, а таксама ІМПЗ. Паводле інфармацыі ДУ «Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Цэнтральнага раёна г. Мінска», пры правядзенні агляду тэрыторыя зямельнага ўчастка знаходзілася ў належным санітарным стане. Паводле інфармацыі ІМПЗ Цэнтральнага раёна г. Мінска, уласнік жылога дома, размешчанага на зямельным участку, знаходзіцца на ўліку ў інспекцыі ў якасці плацельшчыка падатку на нерухомасць і зямельнага падатку за карыстанне зямельным участкам. Па выніках праведзеных мерапрыемстваў спецыялістамі ІМПЗ парушэнняў заканадаўства не ўстаноўлена. Пасля праведзенай праверкі супрацоўнікамі Цэнтральнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях уласніку гаспадарчай пабудовы, размешчанай на зямельным участку, выдадзена прадпісанне аб неабходнасці ліквідацыі выяўленых парушэнняў.

У выпадку, калі ў пісьмовых адказах на звароты ўтрымліваюцца пастановы аб поўнай або частковай адмове ў задавальненні зваротаў, у такіх адказах указваецца парадак іх абскарджання, адзначыла адвакат.

— Аналіз дакументальных матэрыялаў, звязаных з разглядам калектыўнага звароту ў адміністрацыю Цэнтральнага раёна г. Мінска, паказаў, што заяўнікам накіраваны абгрунтаваны і матываваны адказ, падпісаны намеснікам старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, а таксама растлумачана права на абскарджанне адказу ў судовым парадку. Права на абскарджанне атрыманага адказу ў судовым парадку заяўнікамі рэалізавана не было.

У далейшым заяўнікі неаднаразова звярталіся ў Цэнтральны раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях. Імі атрыманы адказы, дзе пазначана, што ў адрас уласніка накіравана прадпісанне аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў заканадаўства аб пажарнай бяспецы, супрацьпажарных патрабаванняў тэхнічных нарматыўных актаў сістэмы супрацьпажарнага нармавання і стандартызацыі з указаннем тэрміну выканання. Таксама ў адпаведнасці з арт. 24.36 ч. 7 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі) уласнік жылога дома прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

Заяўнікі таксама рэалізавалі сваё права на зварот да пракуратуры. Копія звароту была накіравана ва УУС адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска. Згодна з атрыманым адказам, у ходзе праверкі парушэнняў дзеючага адміністрацыйнага і крымінальнага заканадаўства выяўлена не было, а далейшая праверка па калектыўнай заяве спынена.

— Аднак у далейшым, пасля паўторнага звароту ў пракуратуру Цэнтральнага раёна г. Мінска, пракуратурай раёна запатрабаваныя і вывучаны матэрыялы праверкі па калектыўных зваротах з адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска, ІМПЗ, Цэнтральнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, ДУ «Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Цэнтральнага раёна г. Мінска». Пракуратурай раёна кіраўніку адміністрацыі раёна накіраваны інфармацыйны ліст аб неабходнасці прыняцця дадатковых мер па недапушчэнні выкарыстання ўласнікам зямельнага ўчастка ў парушэнне праектнай дакументацыі.

Заяўнікам дадзены абгрунтаваны і матываваны адказ, падпісаны кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска. Ён утрымлівае таксама парадак абскарджання ў выпадку нязгоды — заяўнікі маюць права абскардзіць атрыманы адказ у Мінгарвыканкам.

— Адказ арганізацыі на зварот або рашэнне аб пакіданні звароту без разгляду па сутнасці пра абскарджання ў вышэйстаячую арганізацыю можа быць абскарджаны ў судзе ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, — падкрэсліве адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена Гронская.

Такім чынам, сітуацыя яшчэ далёкая да развязкі. А пакуль жыхарам прыватных дамоў па вуліцы Наватарскай застаецца... працягваць пісаць скаргі і звароты.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Надвор'е

# У ПАНЯДЗЕЛАК ДА НАС ПРЫЙДЗЕ ДОЎГАЧАКАНАЕ ЦЯПЛО — ДА ПЛЮС 23 ГРАДУСАЎ

## Але ў найбліжэйшы час дажджы так і не спыняцца

**Як адзначаюць сіноптыкі, у хуткім часе паветраныя патокі зменяць свой кірунак на паўднёва-заходні, і ў нашу краіну пачне паступаць больш цёплая паветраная маса. Тэмпературны фон павысіцца і наблізіцца да сваёй кліматычнай нормы, а месцамі нават перавысіць яе. У большасць дзён пройдуць дажджы, тым самым перапаўняючы чашу красавіцкіх ападкаў.**

А ў апошні рабочы дзень і ў выхадныя ў нашай краіне будзе адносна халодна і пасапраўднаму мокра, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.



У суботу месцамі адзначацца нават моцныя дажджы. Тэмпература паветра ноччу будзе плюс 3—9 градусаў, а ўдзень — ад плюс 9 да 16 цяпла.

У нядзелю ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі па краіне зноў пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 4 да 10 градусаў вышэй за нуль, а ўдзень — ад плюс 11 градусаў да 18 цяпла.

Тэмпературны фон пачне значна павышацца ў паўднёвай частцы нашай краіны ў панядзелак на наступным тыдні. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першыя суткі гэтага тыдня ноччу месцамі, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 4 градусаў да 10 цяпла, удзень ад плюс 12 да 19 градусаў, а па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да плюс 20—23 градусаў.

Але добрае цяпло не пратрымаецца доўга. У аўторак ноччу месцамі, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература начнога паветра складзе плюс 3—10 градусаў, удзень — плюс 9—16, а па паўднёвым усходзе будзе крыху цяплей — да 19 вышэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Сядзі і глядзі

# ШТО ЗАСТАЕЦЦА ПАСЛЯ...

**Якім бы ні было жыццё, мы ніколі не прадкажам яго наступны паварот і тое, як зменіцца ўсё ў наступную хвіліну. Але пасля прагляду фільма «Маналог», які ўбачыў свет паўстагоддзя таму, у 1972 годзе, пераконваешся, што кожны сам піша ўласную гісторыю, расплачваецца за наступствы здзейсненых учынкаў і атрымлівае заслужаныя ўзнагароды. Плюс да ўсяго ў ім цудоўная музыка, выдатная ігра акцёраў і атмасфера Пецярбурга (Ленінграда) таго часу.**

Драму «Маналог» рэжысёра Ільі Авербаха пакажуць на тэлеканале «Культура» на выхадных. ...Мернае жыццё вялікага вучонага, акадэміка Срэценскага ўжо не абяцае ніякіх сюрпрызаў. Ён звыкся са сваімі радасцямі і няўдачамі, даглядае і выхоўвае ўнучку, «падкінутую» дачкой на выхаванне... Але вось нечакана вяртаецца яго «блуднае дзіця» з чарговым мужам. Унучка Ніна якраз перажывае першую асабістую драму, а малады калега Срэценскага пераконвае яго вярнуцца да даўно забытых даследаванняў...

У нядзелю, дарэчы, фільм можна будзе ўбачыць вечарам паўторна. А пасля пакажуць дакументальны кінааповед «Астравы. Ілья Авербах» і пра самога рэжысёра. Ён быў не толькі выдатным рэжысёрам свайго часу, але і выдатнай асобай, якая здолела аказаць уплыў на ўсіх, хто знаходзіўся побач. Сноб, інтэлектуал, бясспрэчны лідар ва ўсіх кампаніях, але пад гэтай абгорткай жыў і пакутаваў чалавек, што вечна спрачаўся з самім сабой і заўсёды быў незадаволены ўласнымі фільмамі і ўчынкамі. Бо ў глыбіні хавалася першапачаткова трагічнае ўспрыманне жыцця. Якім быў, чым уражваў і запомніўся вялікі майстар, а таксама што думаў пра жыццё і мастацтва, даведаемся вечарам 24 красавіка на канале «Культура».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 144

Сваю сумесную задачу нам даслалі Аляксей Азаў з Гомеля і Віктар Жук з Брэста *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Крg1, Лg2, Kb1, Kf3 (4).
**Чорныя:** Крd1 (1).
Мат за 3 хады.
Блізня: пераставіць белага каня b1 на b4.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Задача С. Джавадзадэ, В. Заманава (Азербайджан) і В. Волчака (Беларусь) на «Маскоўскім конкурсе» атрымала чацвёрты пахвальны водгук.

**Белыя:** Кра4, Ле5, Сс4, Кg2, пп. а5, d2, d6, e6, f5, h4 (10).

**Чорныя:** Крd4, пп. а6, d3, h5, h6 (5).

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 23.05.2022 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1** Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 200/U-106068 площадью 1341,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 50/14 (готовность – 5 %) назначение – здание неустановленного назначения, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000172 площадью 6,4641 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 50 (общее долевое право аренды), целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений.

**Нач. цена:** 133 000,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 13 300,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 20.05.2022. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой рыночной оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи предмета эл. торгов. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. 8-0212-265383.




## ЖУЛІК ЁСЦЬ ЖУЛІК

Летась у маёй прыяцелькі Фаіны бульба ўрадзіла, прычым так... «Можна парсючка падгадаваць», — падумала яна. А далей — адшукала ў газеце аб'яву, пазваніла, пачула, што парасяты сапраўды прадаюцца — і нядорага, і выбар ёсць. Фаіна хацела «бландзінчыка» ўзяць, а прыехала глядзець і разгубілася: парасяткі ў загоне маленькія, чорныя, шмат... Столькі — яна ніколі і не бачыла!

— Гэта ад свіней в'етнамскай пароды, — растлумачыў гаспадар. — Гадаваць іх — адно задавальненне! Ядуць — ну ўсё чыста! А вясной ды ўлетку на выган выпусціў, дык і карміць не трэба. Да восені гарантавана кілаграмаў 60 набяруць, а то і на 20 болей... Адзінае — лепей пару браць. Двое лепей растуць.

— Але ж я хацела большанькага, белага, аднаго, — прызналася пакупніца. — На дваіх, на пару я і грошай не брала.

— Дык я вам па-сучаснаму — двух аддам па цане аднаго, — прапанаваў гаспадар.

Угаварыў, карацей, жанчыну: узяла яна парасят, прывезла дамоў, стала карміць і ўсё з думкамі, што столькі свініны ёй, вядома ж, не трэба...

Аднаго парсючка вырашыла сваім пляменнікам аддаць: гарадскія, сямейныя — хай сапраўднай свежыны пакаштуюць.

На «забойства», праўда, іх не паклікала. Спецыяліст быў паблізу, свой, хуценька ўсё зрабіў. Гаспадыні заставалася хіба спарадкаваць: разлажыць, што ў маразільнік з халадзільнікам, што ў кубельчык... А тое, што для пляменнікаў — пабрацку, пароўну — у пакецікі ды пакеты.

У той жа дзень хлопцы па іх прыехалі і забралі...

Віця дадому прывёз, на стале разлажыў — можна сказаць, падарунак лёсу: там салка, там паляндвічка, там ножкі на халадзец...

— А на боршчык рабрынак што — не было? — пытае жонка.

Гаспадар глядзіць ды патыліцу чухае:

— Можа, цётка іх не паклала? Можа, сам правароніў — не ўсе пакеты ўзяў? А можа, у свіней в'етнамскай пароды толькі хрыбетнік, а ўсё астатняе — сала ды мяса?

— Ты што — з глузду з'ехаў? — з недаверам спытала жонка, але сварыцца ды нешта высвятляць не стала. Варыла ж яна боршчык раней, будзе варыць і далей — нейкія скабкі знойдуцца.

...І сапраўды яны, можна сказаць, знайшліся, бо вечарам тога ж дня пазваніла цётка і стала выбачацца: маўляў, знайшла вінаватага. Пакет з рабрынкамі сабака сцягнуў, Жулік. Відаць, і ён захацеў адмысловай, в'етнамскай свежыны.

— І каб галодны быў, — абуралася Фаіна. — А то ж карміла сабаку!

— Не перажывайце, — супакоіў цётку Віктар. — Жулік — на тое і Жулік, каб нешта ўкрасці... Будзеце новага сабаку заводзіць, думайце, як назваць.

— Не, Віця, калі бульбачка ўродзіць, я лепш новых парасятак куплю. І сабе мяса будзе, і вам.

Фаіна паабяцала. А значыць, пасадзіць бульбу, вырасціць ураджай і парасят, напэўна ж, купіць...

Якіх? Пажывём — пабачым.

**Т. Новік,**

*г. Клецк.*

## НЕ ВУЧЫЦЕ РЫБУ ПЛАВАЦЬ

...Той калгас называўся гучна — «Чырвоны барацьбіт»! І, напэўна ж, змагаўся ён за высокія паказчыкі, але ніколі іх не меў. А значыць, і людзі не мелі добрых заробкаў, умоў для работы, для жыцця. Спецыялісты, а найбольш механікі, увесь час звальняліся, раз'язджаліся хто куды, а на іхнія месца, часова, ставілі тады Сцяпана.

Ён дзядзька галаваты быў: разбіраўся ў зварцы, у зборцы, кавальскую справу ведаў. Не бяда, што адукацыі восем класаў — Іванавіч спраўляўся, прычым і на чужой пасадзе механіка, і на сваёй — трактарыста. Рукі ў яго ўмелыя былі...

Дык вось неяк Сцяпана разам з іншымі спецыялістамі ў райвыканкам выклікаюць: кажуць, нарада там па падрыхтоўцы тэхнікі да веснавых работ.

У калгасе «Чырвоны барацьбіт» з гэтым нядрэнна было: гатоўнасць — амаль 80 працэнтаў. Можна было б і болей зрабіць, але...

Іванавіч ведаў, што для гэтага трэба, прадумаў, як сказаць, калі раптам спытаюць. Прыбраўся яшчэ (да людзей жа ідзе, да начальства). Белую кашулю надзеў, новае галіфэ, хромавыя боты... Усё чыстае... Не чакаў, што яго там з граззю змяшаюць. І дарэмна.

Пра недахопы ў яго калгасе спачатку дакладчык казаў, а потым і Сцяпана з месца паднялі — на трыбуну пайшоў.

Непрывычнае месца, хваляваўся чалавек, але ж сказаў, што для рамонту тэхнікі бракуе запчастак, што ў майстэрні — амаль ніякіх умоў для работы. Але ж галоўнае — не хапае кадраў. «Тэхніку з горам папалам мы, можа, і паправім, — казаў начальству трактарыст. — А вось каго на яе пасадзіць? Мала ў нас механізатараў (пра вакансію механіка Сцяпан змаўчаў — думаў, што начальства і так ведае)...

А яно, падобна, забылася, бо, пачуўшы Сцяпанава «няма каго пасадзіць на трактар», дакладчык аж з крэсла падскочыў — закрычаў:

— Як гэта няма?..Чаму? Распусціў свае кадры? Тады сам галіфэ знімай ды садзіся...

Сцяпан на гэтыя словы, мякка кажучы, здзівіўся, бо на яго нават жонка голас не павышала, аднак псіхаваць не стаў. Сказаў:

— Спалохалі вожыка голым задам! Ды я хоць сёння на трактар сяду і ўсё, што трэба, зраблю! А вы, як выглядае, толькі крычаць і можаце!

Сказануў так, сышоў з трыбуны, а назаўтра і сапраўды здаў «партфель» механіка, сеў на трактар, потым — на камбайн... Вельмі ўдала сезон адпрацаваў: мала таго, што грошай зарабіў, дык яшчэ і медаль...

Уручаць яе меліся ў райцэнтры, магчыма, у той самай зале.

А таму Сцяпанава жонка выцягнула з шафы парадны пінжак, да яго — тую ж белую кашулю, галіфэ...

— Вось яго — схавай! — загадаў Іванавіч. — Не буду надзяваць.

— Але чаму? — не зразумела жонка.

— Дык мяне ж па ім за вярсту пазнаюць, яшчэ вожыка прыпомняць ды вымову дадуць — замест медаля.

...У той раз, дзякуй богу, усё абышлося. Праўда, галіфэ Сцяпан так больш і не надзеў. Пастуху падарыў — хай носіць.

**Васіль Кабачэўскі,**

*г. Орша.*

## ВЫНІК — СПРАВА ДЗЯСЯТАЯ

Гэты кур'ёзны выпадак адбыўся 31 снежня 90-нейкага года ў суседнім райцэнтры. Там тры сяброўкі-цырульніцы, што называецца, дабывалі на рабоце апошнія гадзіны не проста дня і нават месяца — года... Не працавалі, бо кліентаў не было. Што і зразумела: многія спяшаліся дадому сталы накрываць, стаялі ў чэргах. Крамы тады пустыя былі, зялёны гарошак і той з боем бралі, калі яшчэ недзе «выкінуць» (дадуць у продаж).

Факт, што час на тое, каб адзначыць Новы год, у цырульніц быў. Выпівалі-закусвалі, што бог даў. А ён, трэба сказаць, не на жарт расшчадрыўся: адной з дзяўчат прыслалі з вёскі некалькіх кольцаў дамашняй каўбасы і «пластмаску» — 0,7 — самагону. Файна пасядзелі... Мякка кажучы, вясёлыя былі.

А таму, калі ў цырульні «намаляваўся» кліент, выпіхваць яго за дзверы ды казаць, што рабочы дзень амаль скончаны, дзяўчаты не сталі. Наадварот — сустрэлі мужчыну радасна: пачаставалі рэшткамі каўбасы. (Гарэлкай, трэба сказаць, ён пачаставаўся раней, але ж успомніў, што Новы год сустракаць будзе ў кампаніі, у прысутнасці дам. Дзеля іх, падумаў, нядрэнна было б пагаліцца).

— Дык мы ж гэта мігам! — заверылі яго майстрыхі, і самая вопытная з іх, Валянціна, узялася за справу.

«Працэс» пайшоў хутка і досыць весела: кліент, апынуўшыся ў крэсле і ў цэнтры ўвагі, «балдзеў» — рассыпаў камплiменты і распускаў рукі. Валя, спрабуючы ад іх ухіліцца, намыліла яму твар і станком стала саскрабаць шчаціну...

Праз нейкі час з горам папалам галенне было скончана. Мужчына ўбачыў у люстэрку сваю пачырваненую фізіяномію, пагладзіў яе рукой, сказаў:

— Нешта ж калючая... І шчокі гараць.

— Гэта адэкалон такі, — не разгубілася майстар. — Не бойцеся, ён добры. А што не вельмі гладка, дык сам вінаваты: не трэ было замінаць.... Яшчэ дзякуй скажы, што нідзе не парэзала.

— І праўда, дзякуй, — згадзіўся чалавек, разлічыўся, ушчыкнуў-ткі Валю за мяккі бачок і развітаўся.

Сталі збірацца па дамах і цырульніцы. Валянціна ўзялася памыць станок, і...

Такога рогату іх КБА не чуў! І такой «карціны», вядома ж, не бачыў, бо аказалася, што апошні ў тым годзе кліент быў пагалены, як ніхто — станком, у якім не было... ляза.

**А. Навасельская,**

*Мінскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж напамін:** усе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вызначаюць іх, тыя найлепшыя, два журы — малое рэдакцыйнае і вялікае чытацкае, у склад якога рады прыняць кожнага з ахвотных.

Што для гэтага трэба? Па-першае, на працягу года чытаць усе змешчаныя гісторыі (інтэрнэт у дапамогу), па-другое, нейкім чынам пазначаць тое, што спадабалася, для таго каб бліжэй да Каляд назваць сваю дзясятку найлепшых.

Творы, якія набяруць максімум сімпатый, выйдуць у лідары — з усімі адсюль наступствамі ў выглядзе ганаровых дыпломаў і каштоўных прызоў. Так што чытайце і, вядома ж, пішыце! Калі ласка, з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі.

Неасабісты суб'ектыў



# СФЕРА АБСЛУГОЎВАННЯ

### Што агульнага ў някупленай каўбасы і неадрамантаванай батарэі

Патэлефанавала ўчора наша пастаянная чытачка з Баранавіч. Гісторыя ў яе — з серыі «не магу маўчаць». Расказала, як у невялікім прыватным магазінчыку ў сваім мікрараёне каўбасу на Вялікдзень спрабавала купіць. Праўда, не купіла. «Каўбаса тая, ведаеце, такая, пальцам піханая, на вітрыне ў іх цэлымі кольцамі ляжала. Пагладзець, якая яна ўсярэдзіне, ніякай магчымасці не было, а мае дамашнія не любяць, калі сала шмат. Я ў прадаўшчыцы папыталася, а тая толькі буркнула ў адказ: не ведаю, маўляў. Добра, кажу, узважце палову кольца. Тая разрэзала, а там — адно сала. Можа, хто і любіць такую, але я сказала, што купляць не буду. А прадаўшчыца на мяне крыку нарабіла: куды я цяпер яе дзену, гэту каўбасу! І як шпурне тыя кавалкі на прылавак — добра, што не мне ў галаву, ды, напэўна, мянавіта так і хацела зрабіць. Паляцела некуды, ляпнуўшы дзвярыма, пакупнікоў, што стаялі за мной у чарзе, не абслужыла. Людзі сталі абурацца, ад яшчэ аднаго «работніка гандлю» пачулі ў адказ: «Не падабаецца — чаго вы сюды ходзіце!» Вось вам і сфера абслугоўвання. Нібыта яны нам вялікую ласку робяць, што тавары прадаюць. Толькі калі сталі патрабаваць кнігу заўваг і прапаноў, тады супакоіліся, загадчыца выйшла, стала прасіць прабачэння. Думаю, не зусім шчыра, хутчэй дзеля таго, каб мы ў тую кнігу нічога не напісалі... Ну, мы і пашкадавалі. Цяпер думаю: дарэмна. Суседка ўвечары пасля заходзіла і расказвала, што і яна ў той краме пад гарачую руку ўжо пасля нас трапіла»...

Мы пасля доўга з жанчынай гутарылі. Пра тое, што падобныя выпадкі былі скрозь, а цяпер — хутчэй рэдкасць, пра якую нават хочацца, у газету патэлефанаваўшы, расказаць. Бо цяжка ўявіць такія паводзіны ў прадаўца ў буйным магазіне — гэта, напэўна, быў бы яго апошні рабочы дзень. Пра тое, што хамства і нястрыманасці дараваць нельга, але ж і на сябе трэба азірацца, каб не атрымалася, што гэта проста «прыляцела» табе ў адказ. Пра сферу абслугоўвання ўвогуле, не толькі пра гандаль ці цырульню, а пра ўсіх, хто аказвае нам паслугі, а мы за гэта ім плацім грошы. Але чаму часам атрымліваецца, што гэта мы іх абслугоўваем, а не яны нас? Што ў нас — абавязкі, а ў іх — правы, хоць па логіцы павінна быць якраз наадварот...

Я тут нядаўна праз службу 115 паспрабавала ў суботу сантэхнікаў выклікаць. Пачала вада з батарэі прасочвацца, за ноч нацякла добрая-ткі місачка. На дварэ — мароз, праз дзень на работу, што, калі яно будзе вось так падцякаць-падцякаць, а потым возьме ды прарве тую батарэю? Пазваніла сантэхніку ў сваё таварыства ўласнікаў — ён на нейкім семінары ў Гродне. «Звані, — кажа, — у 115, наш дом у іх на абслугоўванні значыцца, павінны кагосьці прыслаць». Добра, званю. Дзяўчына на тым канцы провада спачатку сапраўды ўдакладняла, ці знаходзіцца наш дом на абслугоўванні, пасля некалькі разоў перапытала, які чынам вада з батарэі з'яўляецца: «Ліецца? Капае?». Не, кажу, прасочваецца, але ж вы разумееце — пайду на работу, у доме — дзевятнаццаць паверхаў... «Усё зразумела, дзякуй, чакайце брыгаду»...

Брыгада, трэба аддаць ёй належнае, з'явілася хвілін праз дваццаць. Вясёлыя бесклапотныя дзецюкі, падобныя на Афанасія Баршчова з вядомага фільма. Прыехалі, пэўна, з нейкай каналізацыйнай аварыі — брудныя ў іх былі і абутак, і адзенне. У закарэлых ботах яны жвава прамаршыравалі праз увесь пакой па нядаўна вымытай падлозе, пагладзелі на батарэю, абмеркавалі паміж сабой, што трэба перакрываць стаяк, а ў іх няма часу... Нібы мяне не было побач, паразважалі пра «баб, якія дурныя і панікуюць без прычыны», параілі мне паставіць пад батарэю большую міску, а яшчэ лепш — тазік, і, пакінуўшы за сабой яшчэ адну дарожку брудных слядоў, выйшлі з кватэры...

Вымыўшы за імі падлогу і трошкі ачомаўшыся ад шоку, я ўсё ж такі зноў набрала 115. Мяне цікавіла ўжо толькі адно: што гэта было? Аказалася, «майстры» ўжо мой заказ закрылі: «У вас неаварыйны выпадак». Дык я ж ад пачатку казала, што ён неаварыйны! Навошта тады было пасылаць «брыгаду»? Каб я ва ўласным доме пачула, што я дурніца, і яшчэ раз памыла падлогу?..

Цяпер вось аналізую сваю і расказаную чытачкай «сервісныя» гісторыі і думаю, у чым мы з ёй аднолькава памыліліся. Не давялі справу адстойвання сваіх спажывецкіх правоў да канца. Яна пашкадавала тых хамаватых прадаўшчыц і не пакінула запіс у кнізе заўваг і прапаноў. І проста будзе радзей хадзіць у тую краму. Я не стала настойваць, каб тыя сантэхнікі ці іншыя з той жа службы 115 зрабілі так, каб батарэя не працякала, — на тое яны і сантэхнікі, яны за гэта грошы ад нас атрымліваюць. Я проста дачакалася панядзелка (падставіўшы пад батарэю большую міску) і патэлефанавала нашаму Васілевічу, які вярнуўся са свайго семінара...

Так працей і спакайней, думаем мы. Навошта людзям псаваць жыццё, думаем мы. Абслугоўваем тым самым сферу абслугоўвання. Бо яны, атрымліваецца, галоўныя, а мы так, на падтанцоўцы...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Банк РРБ
на твоей скорости

**Закрытое акционерное общество
«Банк роста и развития бизнеса»**

220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18

**www.rrb.by**

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 апреля 2022 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2022 | 01.01.2022 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 28 877 | 27 155 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 51 850 | 51 940 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 33 973 | 36 492 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 43 442 | 37 602 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 250 472 | 245 704 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 27 610 | 28 560 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 4 054 | 4 021 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 3 685 | 2 951 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 443 963 | 434 425 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 4 002 | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 19 407 | 1 635 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 361 827 | 374 201 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 4 145 | 3 578 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 2 016 | 1 840 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 391 397 | 381 254 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 20 429 | 20 429 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 9 976 | 8 990 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 12 441 | 12 441 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 9 720 | 11 311 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 52 566 | 53 171 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 443 963 | 434 425 |

Форма 2

## ОТЧЕТ
## о прибылях и убытках
на 1 апреля 2022 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2022 | 01.04.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7 742 | 7 774 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 6 005 | 6 400 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 737 | 1 374 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 863 | 4 307 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 682 | 549 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 181 | 3 758 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 3 | (208) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 5 008 | 1 979 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4 757 | 1 768 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 537 | 343 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6 051 | 4 755 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 263 | 260 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | (605) | 463 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | - | 22 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | (605) | 441 |

И.о. Председателя Правления
Заместитель Председателя Правления — В.Н. Поболь

Главный бухгалтер — Н.Н. Мостыко

Дата подписания: 19 апреля 2022 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 21
выдана 22 июня 2020 года Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100361187.

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390** |
| **Продавец** | **Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24. УНП 600037767** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. УНП 191224638** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет повторного электронного аукциона**

**Лот № 1**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, ул. Слуцкое шоссе, 26**

**Здание магазина** (общ. пл. 268,9 кв. м, инв. № 600/С-171336, составные части: пристройка, сарай-пристройка, сарай).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1222** га, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 25.01.2120) для строительства и обслуживания магазина. Ограничения (обременения) прав: природная территория, подлежащая спец. охране (в зоне санит. охраны источников питьевого водоснабжения централиз. систем питьев. водоснабжения (3-й пояс-262, 267-268)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 469 862,64 бел. руб.**
(снижена на 35 %)

**Лот № 2**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, аг. Озерцо, ул. Центральная**

**Магазин № 1** (общ. пл. 127,2 кв. м, инв. № 600/С-132938, составные части: пристройка, склад, уборная).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0885** га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 04.04.20141) для обслуживания здания магазина № 1

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 180 872,46 бел. руб.**
(снижена на 60 %)

**Лот № 3**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, пер. Калинина, д. 36**

**Столовая** (общ. пл. 282,8 кв. м, инв. № 600/С-117001, составные части: три пристройки).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0659** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 192 060,00 бел. руб.**
(снижена на 60 %)

**Лот № 4**
**Адрес: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница**

**Здание торгового центра** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 3109,6 кв. м, инвентарный номер 600/С-100734, составные части и принадлежности: подвал, площадка).
***Сведения о земельном участке***: общей площадью 0,5973 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли.
***Обременение:*** площади здания частично сданы в аренду. Договоры аренды № 24/21 от 31.03.2021 с ОАО «Белагропромбанк», № 22/21 от 31.03.2021 с РУП «Белпочта» без возможности досрочного расторжения до 31.10.2026»

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 2 990 000,00 бел. руб.**
(снижена на 13 %)

**Лот № 5**
**Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Новая Заря, 34А-2**

**Кафе «Хельсинки»** (помещение общественного питания, общ. пл. 768,1 кв. м, инв. № 602/D-35365)

**Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 709 560,32 бел. руб.**
(снижена на 10 %)

**Лот № 6**
**Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Молодежная, 12**

**Административное здание** (общ. пл. 1079,3 кв. м, инв. № 630/С-54835).
***Сведения о земельном участке:*** **пл. 0,1244 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания администрат. здания

**Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 660 960,00 бел. руб.**
(снижена на 40 %)

**Лот № 7**
**Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, д. Мижречье, ул. Центральная, д. 2А**

**Магазин** (здание специализированное розничной торговли, общ. пл. 39,7 кв. м, инв. № 602/С-45187, составные части и принадлежности: сарай-пристройка).
***Сведения о земельном участке:*** **пл. 0,0179 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона р. Свислочь

**Начальная цена лота № 7 с НДС 20 % – 3 297,49 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение по лотам №№ 1–3, 5–7 – 4 %, по лоту № 4 – 1,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 07.04.2022

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов в 13.00 12.05.2022. Окончание торгов в 14.00 12.05.2022.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 11.05.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-4101 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина) общей площадью 44,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, Новогрудский р-н, Любчанский с/с, г. п. Любча, пл. Солобутина, 9а.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424355700001000538 площадью 0,0089 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), находящемся по адресу: Гродненская область, Новогрудский р-н, г. п. Любча, пл. Солобутина, 9а.
Начальная цена продажи лота – 7535,90 руб. (семь тысяч пятьсот тридцать пять белорусских рублей, 90 копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 753,59 (семьсот пятьдесят три рубля пятьдесят девять копеек)

Продавец – Новогрудский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231400, г. Новогрудок, ул. Гродненская, 103, тел. 8-01597-239-52

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 26 мая 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 24 мая 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**

---

## ИНФОРМАЦИЯ
### об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Полесьежилстрой» за 2021 г.

1. Информация о дивидендах и акциях:

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 846 | 846 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 8 | 8 |
| доля государства | лиц | - | - |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | - | - |
| в том числе: физических лиц | лиц | 838 | 838 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 1 | 1 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,00 | 0,00 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | | |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | | |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | | |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 183,92 | 244,6 |

2. Отдельные финансовые результаты деятельности:

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 93911,00 | 105292,00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 91737,00 | 101911,00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | -5758,00 | 2005,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 2174,00 | 3381,00 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -7859,00 | -1634,00 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -73,00 | 258,00 |
| Налог на прибыль | тысяч рублей | 538,00 | 819,00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | -5220,00 | 1186,00 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | -58,00 | 6225,00 |

3. Среднесписочная численность работающих (человек): 1345.
4. Основные виды продукции или виды деятельности: подрядные работы
5. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утвержден годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 30.03.2022 г.
Дата подготовки аудиторского заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности: 09.03.2022 г.
Период, за который проводился аудит: 01.01.2021 г. – 31.12.2021 г.
Аудиторская организация: индивидуальный предприниматель Ульчик Валерий Константинович.
Место жительства: Брестская область , Жабинковский район, д. Бусни, ул. Колхозная, дом 54.
Зарегистрирован: 01.08.2013 за № 290244551.
Аудиторское мнение: годовая индивидуальная бухгалтерская отчетность открытого акционерного общества «Полесьежилстрой», подготовленная в соответствии с законодательством Республики Беларусь, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение открытого акционерного общества «Полесьежилстрой» на 31 декабря 2021 года, а также финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения, в том числе движение денежных средств, закончившийся на эту дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
6. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения: регламент работы с реестром владельцев ц.б. и положение об учете аффилированных лиц, утвержденные внеочередным общим собранием акционеров (прот. № 120 от 20.06.2019 г.).
7. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: pzs.by

УНП 200050191

# ФУТБОЛЬНЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ



**Па гарызанталі:** **1.** Футбольны клуб г. Салігорска, лідара першынства Беларусі па футболе ў 2021 годзе сярод камандаў вышэйшай лігі. **3.** Прыгожы парны танец, міжнародны дзень якога адзначаецца 11 снежня. **5.** Паводле футбольнага лексікона — матч без забітых мячэй; («Матч без гола — гэта як каханне без пацалунка» Ж. Альтафіні). **8.** «Наша Таня гучна плача, // Не забілі нашы мячык. // Ціха, ... , не плач, // Хутка будзе новы матч». З вершапародыі на верш А. Барто «Таня» невядомага аўтара. **9.** Галінка хвойнага дрэва. **10.** Наносны пясчаны пагорак. **12.** У валейболе ўдар мяча ў нападзенні, выкананы з малой сілай. **14.** Вада і ... ломіць (*прык.*). **16.** Удача, поспех. **17.** Мужчынскі галаўны ўбор у мусульман. **19.** Няўдалая апрацоўка мяча. **21.** Падлетак на судне. **22.** У футболе, хакеі гулец нападзення. **26.** Хет — ... , тры мячы, забітыя гульцом за адзін матч; яго ў 2021 годзе здзейсніў Д. Лапцеў, гулец футбольнага клуба «Рух» (г. Брэст). **27.** «... — не футбол, другога тайма не будзе». Цытата невядомага аўтара. **28.** Гулец сярэдняй лініі.

**Па вертыкалі:** **1.** Бомы, ... . Званочкі, якія прымацоўваюцца да хамута або дугі. **2.** У зімы ... шырокі (прык.). **3.** Жартаваў Мартын, ды зваліўся пад ... (прык.). **4.** Металічны крук. **5.** ... баяцца, а пенальці біць трэба (*футбольная прык.*). **6.** Той, хто піша кнігі, стварае музыку; ... забітага гола. **7.** У футболе і хакеі варатар; легендай у гісторыі сусветнага футбола з'яўляецца савецкі ... Л. Яшын, які адбіў ад сваіх варот больш чым 150 пенальці. **11.** Вядзенне мяча гульцом. **13.** Этап футбольнага спаборніцтва. **14.** «Добры той ... , што ў чужых варотах». В. Нагіх. **15.** «Футбольны каментатар — ... , які прафесійна перашкаджае глядзець футбол». Жарт М. Званарова. **18.** «Футбол — гэта ... для мас». Цытата невядомага аўтара. **20.** Аўтар эпічных твораў. **23.** Вузкія звілістыя грады, складзеныя галькай, пяском. **24.** Вокліч пры тэлефоннай размове. **25.** Тое, што і паветра (*разм.*).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** **1.** «Шахцёр». **3.** Танга. **5.** Вата. **8.** Танечка. **9.** Хвоя. **10.** Выдма. **12.** Накат. **14.** Млын. **16.** Спор. **17.** Чалма. **19.** Абрэз. **21.** Юнга. **22.** Форвард. **26.** Трык. **27.** Жыццё. **28.** Хаўбек.

**Па вертыкалі:** **1.** Шархуны. **2.** Рот. **3.** Тын. **4.** Гак. **5.** Вочы. **6.** Аўтар. **7.** Галкіпер. **11.** Дрыблінг. **13.** Тур. **14.** Мяч. **15.** Чалавек. **18.** Балет. **20.** Эпік. **23.** Озы. **24.** Алё. **25.** Дух.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.53 | 20.24 | 14.31 |
| Віцебск — | 5.40 | 20.17 | 14.37 |
| Магілёў — | 5.43 | 20.14 | 14.31 |
| Гомель — | 5.44 | 20.07 | 14.23 |
| Гродна — | 6.09 | 20.38 | 14.29 |
| Брэст — | 6.14 | 20.35 | 14.21 |

**Месяц**

*Поўня 16 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**

*Пр.* Вадзіма.
*К.* Настассі, Яўгеніі, Лукаша, Лявона, Фелікса.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**22 КРАСАВІКА**

У краіне

**1503** год — пасля заканчэння вайны Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ за ўсходнеславянскія землі, што ўваходзілі ў склад княства (1500—1503), былі падрыхтаваны і зацверджаны «перамірныя граматы», якія абвясцілі шасцігадовае перамір'е і абазначылі новыя граніцы паміж дзяржавамі. Да Масквы адышла вялікая тэрыторыя ВКЛ з гарадамі Бранск, Гомель, Чарнігаў.

**1917** год — нарадзіўся (в. Скрэбні Віцебскага раёна) Уладзімір Ануфрыевіч Канаваленка, Герой Савецкага Саюза. Удзельнік савецка-фінскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную са студзеня 1942 года на фронце. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў. Камандзір стралковага палка маёр Канаваленка вызначыўся ў 1943 годзе пры вызваленні Чарнігаўскай вобласці і Украінскага Палесся. Полк пад яго камандаваннем першым фарсіраваў рэкі Сейм, Дзясну, Дняпро, Прыпяць. Загінуў у баі ў 1944 годзе.

**1928** год — у беларускім кінематографе з'явілася дзіцячае кіно — выйшаў першы мастацкі фільм для дзяцей «Грышка-свінапас».

**1938** год — была прынята пастанова СНК СССР «Аб гарадскім будаўніцтве ў Магілёве ў сувязі з пераводам сталіцы БССР».

У свеце

**1370** год — пачатак будаўніцтва крэпасці Бастылія.

**1500** год — партугальская эскадра пад камандаваннем Педру Алварэша Кабрала адкрывае ўзбярэжжа будучай Бразіліі.

**1724** год — нарадзіўся Імануіл Кант, нямецкі філосаф. Адзін з цэнтральных мысліцеляў эпохі Асветы. Усебаковыя і сістэматычныя працы Канта ў галіне метафізікі, этыкі і эстэтыкі зрабілі яго адной з самых уплывовых фігур у заходняй філасофіі Новага часу.



**1870** год — нарадзіўся Уладзімір Ільіч Ульянаў-Ленін, расійскі рэвалюцыянер, савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч, заснавальнік і першы кіраўнік савецкай дзяржавы.

**1937** год — нарадзіўся Джэк Нікалсан, амерыканскі акцёр, сцэнарыст, рэжысёр, прадзюсар. Здымаўся ў фільмах «Пралятаючы над гняздом зязюлі», «Іствікскія ведзьмы», «Паштальён заўсёды тэлефануе двойчы» і іншых. Неаднаразовы лаўрэат прэміі «Оскар», а таксама іншых прэстыжных міжнародных прэмій у галіне кінамастацтва.

**1970** год — у мэтах ахоўы навакольнага асяроддзя праведзена першая акцыя па ініцыятыве грамадскасці ЗША, замацаваная пазней Генеральнай Асамблеяй ААН як Міжнародны дзень Маці-Зямлі.

Так гаварыў...

**АНАТОЛЬ СЕРБАНТОВІЧ:**

*«Не дай вам бог з нялюбай*
*целавацца,*
*Сваю сям'ю чужому пакідаць.*
*І ад зямлі — не дай вам! — адарвацца,*
*А галавою неба не дастаць!»*




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым знач-ком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 977.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 красавіка 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12